УДК 008(063)
ББК 71(0)
А43

Редакционная коллегия:
*Т. Г. Барановская* (гл. ред.), *Д. Стракшене,*
*И. Ф. Двужильная, А. Б. Коженевская, М. П. Чайко*

Рецензенты:
*Голешевич Б. О.,* доктор педагогических наук, профессор кафедры музыкального воспитания и хореографии (Учреждение образования «Могилёвский государственный университет имени А. А. Кулешова»);
*Шауро Г. Ф.,* доктор искусствоведения, профессор (Учреждение образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»)

РЕПОЗИТОРИЙ

А43 **Актуальные** проблемы мировой художественной культуры : материалы VII междунар. науч. конф., посвящ. памяти проф. У. Д. Розенфельда (Гродно, 16–17 окт. 2014 г.). В 2 ч. Ч. 1 / ГрГУ им. Я. Купалы ; редкол.: Т. Г. Барановская (гл. ред.) [и др.]. – Гродно : ГрГУ, 2015. – 300 с.
ISBN 978-985-515-829-6 (ч. 1)
ISBN 978-985-515-828-9

Представлены доклады, посвящённые актуальным проблемам мировой художественной культуры. Всестороннему анализу подвергаются основополагающие вопросы и закономерности развития мирового культурного процесса на современном этапе. Адресуется преподавателям средних и высших учебных заведений, научным работникам, работникам органов государственного управления и всем интересующимся указанными проблемами.

**УДК 008(063)**
**ББК 71(0)**

**ISBN 978-985-515-829-6 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-515-828-9**

© Учреждение образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы», 2015

26. Патрабуе не радзей чым адзін раз у год уносіць змены, дадаткі аб дадзеным аб’екце. Фіксаваць выпускі новай мастацкай, бібліяграфічнай ці дакументальнай інфармацыі у дачыненні даследуемай пабудовы.

Прапануемая «дакументацыйная карта аб’ектаў архітэктуры і будаўніцтва» мае строга вызначаны падыход фіксавання таго ці іншага помніка архітэктуры, дакладнае і сістэмнае апісанне яго гісторыка-культурнай каштоўнасці, сучасны стан даследуемага аб’екта. Універсальнасць дадзенай карты ў тым, што яна разлічана не толькі на кароткачасовае карыстанне, але і мае спецыяльныя пункты, якія дапаўняюцца на працягу некалькіх гадоў, а значыць даюць магчымасць назіраць за зменамі і трансфармацыяй пабудовы і іх фіксаваннем у той жа карце. Гэта дае рухомасць самой карты і аблягчае працу даследчыкаў у перспектыве. На наш погляд, дадзеная дакументацыйная карта ахапіла ўсе неабходныя патрабаванні да апісання і фіксацыі аб’екта, уключае ў сябе 26 пунктаў і падзяляецца на 4 асноўныя этапы даследчай працы.

*Спіс літаратуры*

1. Лукашевич, В. К. Научный метод. Структура, обоснование, развитие / В. К. Лукашевич; науч. ред. А. Н. Елсуков. – Минск: Навука і тэхніка, 1991. – 207 с.

2. Морозова, О. В. Структура метода историко-архитектурного исследования (на примере иконологического анализа памятника архитектуры) / О. В. Морозова // Архитектон: известия вузов [Электронный ресурс]. – 2011. – № 34. Приложение. – Режим доступа: http://archvuz.ru/numbers/2011_22/03. – Дата доступа: 05.10.2014.

3. Якимович, Ю. А. Зодчество Белоруссии XVI – середины XVII в.: справ. пособие / Ю. А. Якимович. – Минск, 1991. – 120 с.

*In article questions of methodology and a technique of research of architectural monuments of Grodnenshchina and their approbation are considered during scientific expeditions as a result of which the methodical card of research of objects of architecture was made.*

***Словік Святлана Уладзіславаўна,*** старшы выкладчык кафедры турызму і культурнай спадчыны ГрДУ імя Я. Купалы, г. Гродна.

РЕПОЗИТОРИЙ

УДК 008

**А. Л. Сяліцкі**

## МАСТАЦКІ ПЕЙЗАЖ У ТВОРЧАСЦІ Э. АЖЭШКІ ЯК СРОДАК АДЛЮСТРАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ РЭЧАІСНАСЦІ КАНЦА XIX СТАГОДДЗЯ

*З выкарыстаннем семіятычнага падыходу раскрываецца роля мастацкага вобраза прыроды ў апавяданнях Э. Ажэшкі ў адлюстраванні асноўнай праблематыкі сацыяльна-палітычнага жыцця беларускага народу канца XIX стагоддзя.*

З другой паловы XIX стагоддзя ў беларускім мастацтве нарастаюць тэндэнцыі да крытычнага адлюстравання сацыяльнай рэчаіснасці. Нацыянальна-вызваленчы рух, сялянская рэформа 1861 года абуджалі ў колах творчай інтэлігенцыі імкненне да шырокага ахопу падзей сацыяльна-палітычнага жыцця грамадства, рэалістычнай перакануўчасці сюжэтнай фабулы і тыпалагічнай праўдзівасці створаных вобразаў. Творчасць У. Сыракомлі, Ф. Багушэвіча, Э. Ажэшкі і інш. уздымалі пытанні нацыянальнай унікальнасці беларускага народа, паўнавартасці яго культурнай спадчыны. Звяртаючыся ў сваіх творах да жыцця бяднейшых слаёў тагачаснага беларускага грамадства, аўтары імкнуліся раскрыць душэўнае багацце сялянаў, іх маральную сілу, мудры погляд на свет і месца чалавека ў ім. Выразным прыкладам гэтаму з'яўляюцца творы Э. Ажэшкі (1841–1910). В. Гапава ў артыкуле «Каралева жывога слова» справядліва адзначыла, што, «працягваючы традыцыі Міцкевіча, пісьменніца <...> са спагадай зазірнула ў хату беларускага селяніна, жахнулася яго нядолі, але і ўбачыла высакародную духоўную прыгажосць беларусаў, працавітасць і пачуццё адзінства з прыродай, непаўторнасць залатых россыпаў вусна-паэтычнай творчасці» [1, с. 6]. Імкненне Э. Ажэшкі да рэалістычна дакладнага адлюстравання складанасці сацыяльнага становішча сялян у парэформенай Расіі абумовіла псіхалагічную заглыбленасць мастацкага вобразу прыроды ў яе творах. Гэта дазволіла пісьменніцы стварыць неабходную атмасферу дзеяння, падкрэсліць унутраныя перажыванні герояў, іх душэўны стан. У аповесці «Нізіны» (1884) пейзажныя вобразы выразна характарызуюць бязвыхаднае становішча галоўнай гераіні – парабчанкі Хрысціны. Простая сялянка, яна імкнецца вызваліць свайго сына ад вайсковай павіннасці, дзеля чаго ёй неабходна шукаць літасці ў «вышэйшых» колаў – аканома Бахрэвіча, адваката Капроўскага. Шчырая і добрая, але безабаронная ў існуючых жыццёвых умовах, Хрысціна апынулася адзін на адзін з астатнім светам – сацыяльным і прыродным. Стан засяроджанасці на сваім клопаце, і разам з тым адзіноты выразна раскрываецца праз пейзажныя апісанні: «Імжэў дождж. Было пахмурна і ціха. Па дарозе, абсаджанай рэдкімі дрэвамі, ішла босая жанчына ў сярмязе. Ян ішла хутка, не разбіраючы дарогі ў змроку і мгле, не абмінаючы ні лужын, ні глыбокіх каляін, якія з-пад яе босых ног пырскалі вадой і рэдкай сакавіцкай гразёй. Цяжкімі і дужымі былі гэтыя ногі і спрадвеку зжытыя з зямлёй, па якой ішлі. Ім было ўсё роўна, дзе ісці, абы толькі ісці хутка» [2, с. 21]. У гэтай пейзажнай замалёўцы пісьменніца лапідарнымі моўнымі штрыхамі паказвае, з аднаго боку, арганічную еднасць сялянкі і зямлі, на якой яна вырасла і на якой працавала ўсё жыццё, і, ў той жа час, адасобленасць яе ад навакольнага свету, уход у прастору ўласных цяжкіх перажыванняў. Архетып зямлі, які звычайна нясе ў сабе становучую канатацыю, выступаючы асновай чалавечага жыцця, набывае тут адценне інверсіі ўласнага семантычнага значэння: «Яна

нічога не баялася: ні цемры, што насоўвалася з кожным крокам, ні цішыні, якая ахапіла наваколле, ні рассыпаных па палях грушаў-дзічак і таполяў, якія нагадвалі зданяў. І гэтаксама як нішто яе не палохала, так нішто і не захапляла: ні нерухомае скляпенне неба, аздобленае белымі і шэрымі аблокамі, ні пахі зямлі, якія прыносіў з загонаў цёплы вецер, ні зоркі, што самотна там-сям міргалі сярод хмар. Бястрашная і абыякавая да ўсяго, стройная і дужая, гнаная нейкім клопатам, яна ішла і ішла...» [2, с. 21]. У гэтым апісанні адчуваецца канфлікт прыроднага і сацыяльнага свету, асабістага і агульнага. З другога боку, пісьменніца падкрэслівае душэўную моц Хрысціны, яе ўпартае жаданне, нягледзячы на ўсе цяжкасці, выратаваць свайго сына. Не ведаючы, як вырашыцца яе справа, сялянка жыве надзеяй на лепшае, і гэта дае ёй сілы для барацьбы.

Іншую карціну можна ўбачыць у пейзажным апісанні вяртання Хрысціны дадому. Сілы, якія напаўнялі яе дагэтуль, зніклі, надзея зрабілася няпэўнай: «Пакінуўшы фальварак у Лясной, ішла яна раскіслай дарогай па цемры, толькі павольней, як дагэтуль. Нашто ўжо цяпер спяшацца?... Нічога не выхадзіла, таму і прыгорбілася яе высокая постаць і стала цяжкай хада. Цемра ўсё гусцела і гусцела, узняўся вецер і пачаў падаць дробны дождж. Сярод пустых і чорных палёў абсаджаная дрэвамі дарога з Лясной да Вулькі здавалася доўгім тунелем, над якім сярод расплаканых аблокаў не свяцілася ніводная зорка і ў глыбіні якога павольна сунулася жаночая фігурка, самотная і вельмі ж дробная ў параўнанні з навакольным абшарам цемры і пусткі» [2, с. 46]. Рэалістычнае па сваёй форме пейзажнае апісанне, між тым, успрымаецца як метафара жыццёвага шляху жанчыны. Аб гэтым пераканаўча сведчыць выкарыстанне пісьменніцай архетыпа дарогі, якая ў дадзеным тэксце набывае азначэнне «раскіслай». Архетып дарогі звычайна атаесамліваецца з жыццёвым шляхам чалавека. У прыведзеным урыўку «раскіслая дарога» праходзіць праз «цемру», якая «ўсё гусцела і гусцела». *Цемра, пустата, чорнасць* – гэта найбольша часта ўжывальныя Э. Ажэшкай атрыбутыўныя характарыстыкі апісання прыроды, што фарміруе пэўны семантычны кантэкст. У сэнсавым ядры гэтых канцэптаў у сціслым выглядзе закладзена зерне далейшага развіцця падзей. Жыццё Хрысціны пазбаўлена пэўнасці, яна не бачыць у ім прасвету. Цемра, што ахутала прыроду, захінула і перад ёю сэнс і мэту жыцця, калі аднаго з сыноў усёж-такі адправілі ў салдаты, а другі сам адрокся ад сваёй маці. «Такая доля мая, як гэтая ночка!», – кажа сялянка [2, с. 46]. Ноч, якая прыносіць для селяніна адпачынак пасля працоўнага дня, у дадзеным кантэксце выступае як вобраз тупіка, канца, небыцця, за якім пачынаецца Нішто. Цемра адасабляе зямлю, гэтыя «нізіны» чалавечага існавання, ад неба, вобраза чысціні і гармоніі, разбурае іх арганічную ўзаемасувязь паміж сабой і чалавекам. Адбываецца інверсія бінарных апазіцый «верх-ніз». У трактоўцы пісьменніцы «нізіны» сацыяльныя, напрыклад, у вобразе Хрысціны, вы-

ступаюць вяршынямі чалавечага самаахвяравання, мацярынскай любові і клопату, між тым як «вяршыні» грамадства (Бахрэвіч, Капроўскі) на справе дэманструюць «нізіны» людскога духу, «узоры» эгаізму, баязлівасці, падману.

Сэнсава блізкія да пейзажных апісанняў ў аповесці «Нізіны» карціны прыроды ў апавяданні «Зімовым вечарам» (1887). Цэнтральным персанажам твора з'яўляецца селянін, Ясюк Мікула, лёс якога карэнным чынам змяніўся ў выніку сутычкі з афіцыйнымі ўладамі з-за падзелу зямлі. Ясюк адзсядзеў тры гады ў турме, вярнуўся дамоў, аднак, унутрана зломлены, не змог там прыжыцца і вымушаны быў пайсці ў свет, весці жыццё скітальніка. Праз шмат гадоў ён вяртаецца ў родную хату, дзе яго ніхто не пазнае, ды і ён сам не адкрывае свайго імя. Вяртанне адбываецца зімовым вечарам, калі «яшчэ не было позна, але вельмі цёмна. На хмарным небе – аніводнай зорачкі <...> Рака з яе нізкімі берагамі і высокія адкосы катлавіны ледзь-ледзь прасвечвалі праз імглу цьмянай беллю снегу. З аднаго боку, на ўзвышшы, было зусім пуста, толькі сям-там тырчалі тонкімі рысамі дрэвы, а з другога, вышэйшага, боку на фоне цемры яшчэ чарней выступалі плямы сялянскіх дамоў» [3, с. 405].

Семантычны змест карціны прыроды ўтрымлівае ў сабе як мінімум два слаі (ўзроўні). Першы з іх, рэалістычна-апісальны, дазваляе адчуць гнятлівую атмасферу, у якой адбываецца вяртанне Ясюка дадому. Гэты план прачытання мастацкага пейзажу закранае непасрэдна эмацыянальную сферу, стварае адпаведны настрой. На другім узроўні выстройваецца карціна архетыпічных вобразаў-сімвалаў: пустата-рака-дом. Пустату можна трактаваць як небыццё, зону смерці. Менавіта адтуль вяртаецца герой, «памерлы» для сваіх родных. Рака, адзін з модусаў архетыпу дарогі, сімвалізуе сабой і шлях, і мяжу, якая адасабляе сабой свет жыцця ад свету смерці. Дастаткова ўзгадаць раку Стыкс у царстве Аіда з грэчаскай міфалогіі; раку Ніл у Егіпце, на адным з берагоў якой размяшчаўся горад жывых, а на другім – горад памерлых. Архетып дома азначае месца, абжытае чалавекам, прыладжанае да яго запатрабаванняў. Ад гэтага свету героя адзяляе чорная бездань: «Прасторы ночы і адзіноты разліваліся вакол гэтай постаці; шумлівыя хвалі завірухі, здавалася, неслі яе па шырокім, дзікім, панурым улонні прыроды, і перад сілай яе, пагрозамі і веліччу постаць тая была кропкай, крушынкай, зярняткам пяску, каліўцам травы, якое ўпала ў бездань» [3, с. 405]. Карціна вяртання Ясюка ўспрымаецца як спроба чалавека насуперак усім перашкодам выйсці з небыцця да святла жыцця, рэабілітаваць сабе ў вачах іншых, зноў адчуць знітаванасць уласнага лёсу з лёсам родных. Аднак для ўсіх, акрамя бацькі, ён застаецца «разбойнікам», «злыднем» Бонкам. Толькі стары Мікула пазнаў свайго сына і прасціў яго, сказаўшы, як у біблейскай прытчы пра блуднага сына, «Ідзі... І больш не грашы!» [3, с.443].

Фінал апавядання з'яўляецца рэфрэнам пачатку, што ставарае адчуванне бязвыхаднасці чалавечага існавання, перарастае ў сапраўдную экзістэнцыяльную драму: «Нізка над самым рэчышчам зноў ішоў чалавек, зусім самотны. На цьмяным фоне снегу ён быў падобны на тонкую рысу, якая хутка перасякае густую, аднак не такую чорную, як яна, цемру <...> Ён здаваўся маленькай драбніцай, якая плыла па моры бязмежный велічыні. Вялікае мора ночы і адзіноты абдымала яго з усіх бакоў» [3, с. 443]. *Ноч, цемра, чорнасць, адзінота* – гэта атрыбутыўныя характарыстыкі існавання чалавека, жыццё якога проходзіць у «бездані», «нізінах». Аднак кожны раз пісьменніца дае адчуць, што ў глыбіні душы гэтых людзей хаваецца шмат унутранага харства і высакароднасці, якія павінны ў свой час прынесці плады і знайсці выхад да свабоднага жыцця.

Такім чынам, мастацкі пейзаж у творах Э. Ажэшкі валодае глыбокай сэнсавай ёмістасцю, адлюстроўвае асноўныя праблемы сацыяльнага, палітычнага і культурнага жыцця беларускага народа канца XIX стагоддзя.

*Спіс літаратуры*

1. Гапава, В. Каралева жывога слова / В. Гапава // Выбраныя творы / Э. Ажэшка; уклад., прадм. і камент. В. Гапавай. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2000. – С. 5–18.

2. Ажэшка, Э. Нізіны / Э. Ажэшка // Выбраныя творы / Э. Ажэшка; уклад., прадм. і камент. В. Гапавай. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2000. – С. 21–128.

3. Ажэшка, Э. Зімовым вечарам / Э. Ажэшка // Выбраныя творы / Э. Ажэшка; уклад., прадм. і камент. В. Гапавай. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2000. – С. 405–443.

*In article with use of semiotics approach the role of an artistic image of the nature in E. Ozheshki's stories in reflection of the main perspective of socio-political life of the Belarusian people of the end of the 19th eyelid reveals.*

***Сяліцкі Аляксандр Леанідавіч***, выкладчык кафедры мастацкай і педагагічнай адукацыі БДПУ імя М. Танка, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ

УДК 008

**О. В. Финслер**

## ИСКУССТВО СКВОЗЬ ПРИЗМУ ИСПОВЕДАЛЬНОГО ДИСКУРСА

*В условиях антропологического кризиса современной культуры представляет интерес рассмотрение феномена исповеди и художественного творчества, тенденции их взаимодействия. Исповедь человека включает в себя гносеологические, аксиологические и онтологические составляющие и является видом коммуникативного поведения.*

Высказывание Сократа «Человек, познай самого себя» впервые в истории античной философской мысли ознаменовало переход от натур-